Бураўкін А.Г.,
Смолік А.І.,
Дробыш С.І.,
Шаура Р.Ф.,
Зязюля А.Р.,
Кульша В.М.,
Каленька Р.Р.,
Шылкіна А.М.,
Шчаснэя Л.С.,
Зяневіч У.К.

## МАДЭЛІ ЎКАРАНЕННЯ ЭЛЕМЕНТАЎ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У НАВУЧАЛЬНЫ ПРАЦЭС ДЛЯ МАСТАЦКІХ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЙ

Адным з важных стратэгічных накірункаў удасканалення навучальнага працэсу ў сусветнай сістэме універсітэцкай адукацыі з'яўляецца інфарматызацыя. Інфарматызацыя навучальнага працэсу прадугледжвае ўкараненне сродкаў сістэмнай і камп'ютэрнай падтрымкі культуры і мастацтва.




Схема 1

Прапануюцца мадэлі ўкаранення элементаў камп'ютэрных тэхналогій у навучальны працэс на факультэтах мастацкай творчасці і культуралогіі.

Гэтыя мадэлі (схема 1) прызначаны для ўкаранення на кафедрах беларускай народнай песеннай творчасці, харэаграфіі і народных рамёстваў. Асноўнымі структурнымі элементамі гэтай мадэлі з'яўляюцца:

- базавы курс кафедры спецыялізацыі (адпаведна: «Аранжыроўка», «Танцавальны рысунак» і «Колеразнаўства»);

- курс «Асновы камп'ютэрнай тэхнікі»;

- з двума названымі курсамі злучаны - і павінен ісці адразу за імі - змешаны курс (адпаведна: «Элементы камп'ютэрнай апрацоўкі народнай песні», «Камп'ютэрная графіка» ), які будзе выкладацца сумесна кафедрай інфарматыкі і кафедрай спецыялізацыі;

- наступны (па часе) блок мадэлі пакуль што прапануецца ўкараніць толькі на кафедры беларускай народнай песеннай творчасці, але ў перспектыве ён прызначаецца і для кафедраў харэаграфіі і народных рамёстваў. Гэта спалучэнне другога базавага курса («Расшыфроўка фальклорнага матэрыялу») з наступным вывучэннем курса «Элементы камп'ютэрных тэхналогій захавання і апрацоўкі фальклорнага матэрыялу» (на кафедры інфарматыкі).




Схема 2

Другі тып мадэлі (схема 2) прапануецца для спецыялізацый кафедраў народнай інструментальнай творчасці, эстраднага мастацтва, харавога мастацтва і духавой музыкі. Форма - курс (спецкурс) па выбары.

Дашкевіч Г.С.,
Яцэвіч М.А.,
Самайлюк Т.А.,
Кажура І.П.,
Кубліцкая Г.А.,
Бураўкін А.Г.,
Зязюля А.Р.,
Матульскі Р.С.

## КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ АСНОВЫ АЎТАМАТЫЗАЦЫІ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Характэрнай асаблівасцю сучаснага этапа развіцця бібліятэчнай справы ў рэспубліцы з'яўляецца сістэмны падыход да распрацоўкі і ўкаранення інфармацыйных тэхналогій на базе выкарыстання агульнага асяроддзя апрацоўкі інфармацыі, стварэння сеткавых тэхнічных сістэм бібліятэк, падключэння да сусветных інфармацыйных рэсурсаў.